# *Маці - каралева*

*(Quen a omagen da virgin.*

*Las cantigas de Santa Maria, XIII c.)*

*Пераклад і адаптацыя тэкста да мелодыі выканана З. Сасноўскім.*




*2. Пяць сыноў і шмат багацця меў заможны чалавек,*
*Але беды і пракляцці адабралі ўсё навек.*
*За апошняга сына ён шаптаў нясмела:*
*Блаславёна Санта Марыя – маці-каралева.*

*3. І бацькоўская воля – сына ў манастыр аддаць*
*Пад заступніцтва святое, каб яго выратаваць.*
*Сэрца юнака адкрыла, у пабожных спевах,*
*Блаславёна Санта Марыя – маці-каралева.*

*4. Да цудоўнай выявы той юнак насіў заўжды*
*І пітво сваё, і стравы, і душы малітвы.*
*І на моц ягонай веры з літасцю глядзела*
*Блаславёна Санта Марыя – маці-каралева.*

*5. Статуя аднойчы ажыла і прамовіла ў душы:*
*Улюбёны вернік шчыры ратаванне заслужыў*
*Распавёў абату шчыра, што чакае неба,*
*Блаславёна Санта Марыя – маці-каралева.*

*6. І калі Хрыстос паклікаў на нябёсы вячэраць,*
*То абат пакінуў мніхаў юнака суправаджаць.*
*І пайшлі абодва ў Вырай, дзе пануе дзева*
*Блаславёна Санта Марыя – маці-каралева.*

*Copyright © Stary Olsa*